


## § 9. Фактары і віды міграцыі насельніцтва



***Успамінаем.*** Што такое міграцыя? Якія прычыны выклікаюць міграцыю насельніцтва?



***Для чаго мы гэта вывучаем?*** Як уплывае міграцыя на дэмаграфічную сітуацыю ў краіне? З якімі праблемамі сутыкаюцца мігранты ў краіне, што іх прымае?

**Фактары міграцыі насельніцтва.** Міграцыі аказваюць значнае ўздзеянне на геаграфію, структуру і дынаміку колькасці насельніцтва асобных населеных пунктаў, краін і свету. Паколькі міграцыя насельніцтва ўплывае на дэмаграфічныя, эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя працэсы як тэрыторыі выхаду, так і тэрыторыі ўсялення, то на яе аказвае ўплыў мноства фактараў. Фактарамі міграцыі з'яўляюцца агульныя сацыяльна-эканамічныя і іншыя прычыны, якія яе выклікаюць. У найбольш абагульненым выглядзе сярод іх вылучаюць некалькі груп (мал. 56).

Як правіла, сукупнае дзеянне фактараў вызначае міграцыйную рухомасць насельніцтва. Пры гэтым эканамічны фактар гістарычна з'яўляецца вызначальным. Фактары міграцыі можна таксама падзяліць на *тыя, што выштурхваюць*, і *тыя, што прыцягваюць*. Да *першай групы* адносяцца беднасць, голад, нізкі ўзровень жыцця і заработнай платы, перанасяленне краін, якія развіваюцца, высокі ўзровень беспрацоўя, экалагічныя катастрофы, войны, канфлікты, праследаванне і г. д.

У *другую групу* ўключаны больш высокі ўзровень жыцця і аплаты працы, патрэбы эканомік развітых краін і краін, якія актыўна развіваюцца, у працоўных рэсурсах, магчымасці працаўладкавання, бяспека, дэфіцыт уласных працоўных рэсурсаў у развітых краінах, спрыяльныя прыродна-кліматычныя ўмовы і г. д.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| | |
|---|---|
| **ПРЫРОДНЫЯ** | • Аказваюць апасродкаваны ўплыў, іх роля слабее па меры росту ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця.<br>• У спрыяльных для пражывання прыродна-кліматычных умовах ствараюцца перадумовы для прытоку насельніцтва |
| **ЭКАНАМІЧНЫЯ** | • Развіццё эканомікі на тэрыторыях спрыяе стварэнню новых працоўных месцаў і стымулюе прыток насельніцтва і наадварот.<br>• Больш высокі ўзровень даходаў спрыяе адтоку насельніцтва з краін, дзе гэтыя даходы ніжэйшыя |
| **ДЭМАГРАФІЧНЫЯ** | • Стварэнне і распад сям'і спрыяюць міграцыі насельніцтва |
| **ПРАВАВЫЯ** | • Узмацненне жорсткасці прававых нормаў зніжае міграцыйную рухомасць насельніцтва.<br>• Паслабленне прававых норм спрыяе ўзмацненню міграцыі насельніцтва |
| **ПАЛІТЫЧНЫЯ** | • Змена палітычнага рэжыму, рэпрэсіі па палітычных матывах спрыяюць міграцыйнай актыўнасці насельніцтва |
| **ЭКАЛАГІЧНЫЯ** | • Тэхнагенныя і экалагічныя катастрофы ўзмацняюць адток насельніцтва |

Мал. 56. Фактары міграцыі насельніцтва

***У свеце ўсё ўзаемазвязана.*** Прывядзіце прыклады станоўчага і адмоўнага ўплыву міграцый на сацыяльна-эканамічнае развіццё краін і рэгіёнаў як прыбыцця, так і выбыцця. Якія літаратурныя творы, дзе апісваліся міграцыі насельніцтва, вы чыталі?

П₁

**Свет і Беларусь.** Якія міграцыйныя хвалі былі характэрныя для Рэспублікі Беларусь? Якія змены адбыліся ў прычынах, напрамках і хвалях міграцыі ў Беларусі за апошнія 20 гадоў?

**Віды міграцый.** У сучасным свеце існуе вялікая колькасць міграцый, якія адрозніваюцца шэрагам прыкмет. Прасторавыя перамяшчэнні носяць разнастайны характар, таму ў сукупнасці міграцыі класіфікуюць на розныя віды (мал. 57).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Міграцыі па часе (мал. 58) | пастаянныя | | | часовыя | | |
| 2. Міграцыі па геаграфічным ахопе | знешнія (міжнародныя) | | | унутраныя (унутрыдзяржаўныя) | | |
| 3. Міграцыі па прычынах/мэтах | эканамічная | палітычная | экалагічная | этнічная | дэмаграфічная | рэлігійная |
| 4. Міграцыі па форме арганізацыі | арганізаваная | | | індывідуальная | | |
| 5. Міграцыі па характары | добраахвотная | | | прымусовая | | |
| 6. Міграцыі па ступені законнасці | легальная | | | нелегальная | | |

Мал. 57. Віды міграцый




Мал. 58. Міграцыі па часе

Крыніцамі звестак аб міграцыі выступаюць даныя перапісаў насельніцтва, бягучага ўліку, а таксама спецыяльных выбарачных даследаванняў. Вывучэнне міграцыі дазваляе адказаць на многія пытанні. Напрыклад, колькі выехала насельніцтва, хто выехаў, куды выехаў і г. д. Каб правільна адказваць на іх, існуюць паказчыкі для вывучэння міграцыі. Іх можна падзяліць на некалькі груп: паказчыкі маштабаў міграцыі, адносныя паказчыкі міграцыі, паказчыкі структуры міграцыі і інш.

Да паказчыкаў маштабаў міграцыі адносяць наступныя (мал. 59).

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**1. Колькасць мігрантаў, якія прыбылі (П), чал.**

**2. Колькасць мігрантаў, якія выбылі (В), чал.**

**3. Сальда міграцыі (+/–), або міграцыйны прырост (змяншэнне), чал.**
Разлічваецца як розніца паміж колькасцю прыбыўшых мігрантаў і мігрантаў, якія выбылі, за пэўны перыяд (звычайна год) для краіны, рэгіёна, горада, раёна па формуле: МП (МВ) = П – В.
Калі паказчык станоўчы, выкарыстоўваецца тэрмін «міграцыйны прырост», калі адмоўны — «міграцыйнае змяншэнне».

**4. Валавая міграцыя (ВМ), або міграцыйны абарот (МА)**
Разлічваецца як сума колькасці мігрантаў, якія прыбылі і выбылі, па формуле:
ВМ (МА) = П + В.

Мал. 59. Асноўныя абсалютныя паказчыкі вывучэння міграцыі

Асноўнымі *адноснымі паказчыкамі міграцыі* з'яўляюцца каэфіцыенты інтэнсіўнасці прыбыцця, выбыцця і міграцыйнага абароту. Яны разлічваюцца як адносіны колькасці тых, хто прыбыў і выбыў, і міграцыйнага абароту адпаведна да сярэднегадавой колькасці насельніцтва ў разліку на 1000 чалавек і вымяраюцца ў праміле.

$П_2$

*Паказчыкі структуры міграцыі* адказваюць на пытанні, якімі з'яўляюцца мігранты паводле полу, узросту, краіны выезду/уезду, прафесіі, адукацыі, узроўню даходаў, шлюбнага стану і іншых прыкмет. Таму для іх разліку выкарыстоўваюцца адносіны колькасці насельніцтва пэўнай прыкметы да агульнай колькасці мігрантаў, які вымяраюцца ў працэнтах.



Мал. 60. В. Зялінскі, аўтар канцэпцыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу

**Міграцыйны пераход.** Аналагічна тэорыі дэмаграфічнага пераходу чалавецтва ў розныя перыяды спрабавала даваць тлумачэнні прычынам і асаблівасцям міграцыі насельніцтва ў залежнасці ад змен сацыяльна-эканамічных умоў. Гэта знайшло адлюстраванне ў канцэпцыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу В. Зялінскага (мал. 60).

Канцэпцыі дэмаграфічнага і міграцыйнага пераходу цесна ўзаемазвязаны і дапаўняюць адна адну.

***Паразважаем.*** Дэмаграфічнае развіццё і роля міжнароднай міграцыі ў ім істотна адрозніваюцца ў развітых рэгіёнах і рэгіёнах свету, якія развіваюцца. Пацвердзіце ці абвергніце дадзены выраз.

**Міграцыйны пераход — гэта эвалюцыя міграцыі насельніцтва, якая адлюстроўвае заканамерны пераход ад нізкай міграцыйнай рухомасці на аграрнай стадыі да яе росту ў перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.**

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

Згодна з канцэпцыяй, міграцыя насельніцтва перажывае пяць стадый развіцця, якія змяняюцца паралельна сацыяльным і эканамічным зменам у грамадстве (мал. 61).

На *першай стадыі* ў даіндустрыяльным грамадстве міграцыя абмежаваная. Маюць месца толькі нязначныя перамяшчэнні людзей па прылеглай тэрыторыі пры нязначным натуральным прыросце, высокай нараджальнасці і высокай смяротнасці насельніцтва. Гэту стадыю ўсе краіны свету да цяперашняга часу завяршылі.




Мал. 61. Стадыі міграцыйнага (мабільнага) пераходу

*Другая стадыя* супадае з пачаткам дэмаграфічнага выбуху. Яна характарызуецца міграцыяй з вёскі ў горад, ростам перамяшчэнняў на больш далёкія адлегласці, агульным узрастаннем маштабаў міжнароднага міграцыйнага руху. Сёння на гэтай стадыі знаходзіцца невялікая колькасць найменш развітых краін пераважна Афрыкі (напр., Намібія, Эфіопія) і Азіі (напр., Бутан, Непал), і колькасць іх скарачаецца.

На *трэцяй стадыі* захоўваецца рух з вёскі ў горад пры хуткім узмацненні міграцыі паміж гарадамі. Маштабы міграцыі, у тым ліку міжнароднай, узрастаюць. Прысутнічаюць усе спалучэнні міграцыі гарадскога і сельскага насельніцтва. Гэта стадыя прадстаўлена ў большасці краін, Лацінскай Амерыкі, Азіі, шэрага краін Афрыкі, якія развіваюцца (напр., ПАР, Егіпет, Нігерыя), некаторых краінах з пераходнай эканомікай (напр., Польшча, Венгрыя, Расія, Украіна).

На *чацвёртай стадыі* ў познім індустрыяльным і постындустрыяльным грамадстве пры нязначным натуральным прыросце міграцыя з вёскі ў горад у пэўнай ступені захоўваецца, але мае малыя маштабы. Атрымлівае развіццё адваротны міграцыйны рух з горада ў вёску. Узрастаюць аб'ёмы міграцыі з больш буйных па колькасці насельніцтва гарадоў у больш дробныя. Адбываецца значны рост міжнароднай міграцыі. Гэта стадыя характэрная ў асноўным для развітых дзяржаў Еўропы (напр., Германіі, Вялікабрытаніі, Нідэрландаў), часткова прадстаўлена ў ЗША. Шэраг найбольш развітых краін Лацінскай Амерыкі таксама набывае рысы гэтай стадыі (напр., Бразілія, Мексіка).

***Папрацуем з атласам.*** Выкарыстоўваючы матэрыялы вучэбнага дапаможніка і карты атласа, назавіце краіны, якія знаходзяцца на другой, трэцяй і чацвёртай стадыях міграцыйнага пераходу.

*Пятая (заключная) стадыя* разглядаецца як гіпатэтычная стадыя постындустрыяльнага грамадства. Для яе будуць характэрныя пераважна міжгарадская міграцыя і

Правообладатель Адукацыя і выхаванне

пэўныя перасяленні з горада ў вёску. Міжнародная міграцыя захоўваецца, але кантроль з боку дзяржавы ўзмацняецца.

**У свеце цікавага.** У сувязі з заключнай стадыяй развіцця міграцыі цікавасць уяўляе меркаванне італьянскага вучонага П. Прыні пра тое, што «выразнікам сутнасці нашай эпохі з'яўляецца хутчэй качэўнік — чалавек, які вандруе з краю ў край» і ў постындустрыяльным грамадстве «ўсе людзі, незалежна ад сваёй культуры, будуць мігрыраваць». З гэтым сцвярджэннем узгадняецца і канцэпцыя Трэцяга дэмаграфічнага пераходу Д. Коулмэна.

**Падвядзём вынікі.** На міграцыю насельніцтва ўплываюць многія фактары, асноўным з якіх з'яўляецца ... . Міграцыі адрозніваюцца па ..., ..., ..., ..., ..., ... . Сярод паказчыкаў міграцыі вылучаюць тры асноўныя групы — паказчыкі маштабаў міграцыі, адносныя паказчыкі міграцыі, паказчыкі структуры міграцыі. Вылучаюць ... стадый міграцыйнага пераходу. Міграцыйны пераход уяўляе з сябе змену нізкай міграцыйнай рухомасці насельніцтва на аграрнай стадыі яе ростам у перыяд індустрыяльнага і постындустрыяльнага грамадства ў выніку сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

***Праверым свае веды.*** 1. Назавіце асноўныя фактары міграцыі. 2. Што такое міграцыйны пераход? 3. Прывядзіце прыклады міграцый па прычынах. 4. Якія міграцыйныя працэсы характэрныя для вашай мясцовасці?

***Ад простага да складанага.*** На малюнку 62 схематычна прадстаўлена мадэль прыняцця рашэння аб міграцыі Э. С. Лі (1966). Вывучыўшы малюнак, адкажыце на наступныя пытанні: 1. Што пазначана знакамі плюс і мінус у кругах, якія сімвалізуюць рэгіёны выбыцця і прыбыцця мігрантаў? 2. Якія тры фактары могуць разглядацца як прамежкавыя перашкоды?




Мал. 62. Схема «прыцягвання — выштурхвання» ў адпаведнасці з міграцыйнай тэорыяй Э. С. Лі

***Падарожжа па Глабальнай сетцы.***

Сайт Міжнароднай арганізацыі па міграцыі.

Сайт Прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Правообладатель Адукацыя і выхаванне